**ЗВАРОТ**
**Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі**
**адносна дапамогі бежанцам з Украіны**

Шаноўныя святары, браты і сёстры манаскіх супольнасцяў, дарагія браты і сёстры ў Хрысце!

У нашым Звароце на Трэцюю нядзелю Вялікага посту — нядзелю *Caritas* — мы казалі аб тым, што ідзе пошук магчымасці аказаць матэрыяльную і гуманітарную дапамогу пацярпелым ад вайны ва Украіне. Сёння такая магчымасць з’явілася ў сувязі з тым, што наша краіна таксама прымае бежанцаў з ахопленай баявымі дзеяннямі тэрыторыі Украіны. Таму просім арганізаваць збор ахвяраванняў і рэчаў (вопратка, харчаванне) у парафіях з мэтай перадаць іх бежанцам з Украіны, якія ў актуальны момант знаходзяцца на тэрыторыі Пінскай дыяцэзіі, а дакладна ў Гомельскай вобласці. Сабраныя пры парафіях ахвяраванні могуць быць пералічаны на разліковы рахунак *Caritas* Беларусь альбо перададзены ў Курыі дыяцэзій. Збор рэчавай матэрыяльныай дапамогі можна арганізаваць праз парафіяльныя ці дыяцэзіяльныя *Caritas*.

Ужо цяпер шчыра дзякуем усім, хто адгукнецца на гэты заклік і прыдзе з дапамогай братам і сёстрам, якіх вайна вырвала з нармальнага жыцця і прымусіла шукаць паратунку і дапамогі па-за сваім уласным домам. Няхай нашыя адкрытыя сэрцы і канкрэтны ўчынак стануць для іх прытулкам і выратавальным колам ў бядзе, якая іх напаткала.

На гэтую справу міласэрнасці ад усяго сэрца благаслаўляем.

***Каталіцкія біскупы ў Беларусі***

<u>Рэквізіты для ахвяраванняў:</u>

р/р BY33PJCB31350544160010000933
у ААТ «Пріорбанк»
Код банка PJCBBY2X
УНП 101124634
Адрас банка: г. Мінск, вул. В.Харужай 31-А

АРІП
Нумар паслугі: 446571
Дабрачыннасць, Грамадскія аб’яднанні > Рэлігійныя аб’яднанні > Карытас Беларусь> Ахвяраванні